## 24 ліпеня 1904 г. – 120 гадоў з дня нараджэння Барыса Рыгоравіча Ільясюка (1904-1989), ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, дзяржаўнага дзеяча



Барыс Рыгоравіч Ільясюк нарадзіўся 24 ліпеня 1904 года ў в. Пецькі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці).

У час Першай сусветнай вайны сям'я знаходзілася ў бежанстве ў Варонежскай губерні (сяло Троіцкае). Там Барыс Ільясюк закончыў гімназію.

У 1923 годзе вярнуўся ў Заходнюю Беларусь, удзельнічаў у рэвалюцыйнай барацьбе.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў настаўнікам, потым інспектарам райана, дырэктарам дзіцячай тэхнічнай школы Кобрына.

У Вялікую Айчынную вайну Барыс Ільясюк са снежня 1941 года знаходзіўся на фронце. Удзельнічаў у баях за гарады Ялец (Ліпецкая вобл.), Ліўны (Арлоўская вобл.) і інш. Быў цяжка паранены. Лячыўся ў шпіталі, дзе, дарэчы, пазнаёміўся з будучай жонкай.

З 1943 года Барыс Рыгоравіч працаваў у Саўнаркоме Удмурцкай АССР.

Пасля вызвалення Беларусі ў 1944 годзе вярнуўся ў Кобрын. З 1948 года - старшыня Кобрынскага гарвыканкама, з 1959 года - сакратар Кобрынскага гарвыканкама.

Паступова знікалі руіны і завалы на вуліцах Кобрына. Людзі працавалі з энтузіязмам, кожны разумеў неабходнасць хутчэйшага аднаўлення прадпрыемстваў горада. У ліку першых аднавіў работу Кобрынскі райпрамкамбінат. У 1948 годзе з'явіўся кансервавы завод, адзін з першых такіх заводаў у Беларусі. Працавала арцель «Сацпраца» па пашыву адзення, а з 1953 года там пачаўся выпуск жакардавых пакрывал. У 1948 годзе была заснавана арцель імя А. В. Суворава, якая вырабляла мэблю – шафы, спальныя гарнітуры, сталы, трумо, працавалі 30 чалавек.

З 1949 годзе міжраённая майстэрня капітальнага рамонту рэарганізавана ў рамонтны завод. З 1959 года завод праводзіў капітальны рамонт аўтамабіляў ГАЗ-51, іх рухавікоў, рулявога кіравання. У 1955 годзе пачаў працаваць пункт пачатковай

апрацоўкі льну, у 1959 годзе пачаў працаваць ільнозавод. Інтэнсіўнае эканамічнае развіццё горада, вялікія сацыяльныя і культурныя зрухі выклікалі хуткі рост насельніцтва, гэта паўплывала на актыўнае будаўніцтва.

У 1954 годзе Б. Р. Ільясюк, як старшыня гарадскога выканаўчага камітэта, падтрымаў жаданне кобрынчан навучаць дзяцей музыцы, і было прынята рашэнне адкрыць у Кобрыне дзіцячую музычную школу ў гістарычным цэнтры горада на плошчы Камсамольцаў. Дарэчы, яго дачка Ніна Барысаўна доўгі час працавала ў дзіцячай школе мастацтваў г. Кобрына.

У 1964 годзе Б. Р. Ільясюк выйшаў на пенсію. Жыхары Кобрына памятаюць яго як добрага, адказнага чалавека, сапраўднага кіраўніка.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, 9 медалямі.

Барыс Рыгоравіч Ільясюк памёр 4 верасня 1989 года.

Матэрыял падрыхтаваны ў ў 2024 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Ільясюк Барыс Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 242 : фат. - (Крутымі дарогамі вайны).

**Ільясюк Барыс Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 452 : фат. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**120 гадоў** з дня нараджэння Б. Р. Ільясюка (1904) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 121.

**Савчук, М.** Музыкальные искры зажигали зал / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. — 8 января. — С. 5 : фот.

В связи с празднованием 60-летнего юбилея школы искусств г. Кобрина во время экскурса в историю отмечено,

что председатель Кобринского горисполкома Б. Ильясюк принимал решение об открытии музыкальной школы.

**Кобрынскі раён**
**Кобрын**

**Кобрынскі гарвыканкам**

**Ільясюк Барыс Рыгоравіч**

**Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны**
**Франтавікі**
**Дзяржаўныя дзеячы**